УДК 316.728

# ЗДАРОВЫ СПОСАБ ЖЫЦЦЯ – ВЫШЭЙШАЯ КАШТОЎНАСЦЬ АСОБЫ Ў XXI СТАГОДДЗІ

**Таранда М.І., Дуброўскі В.В.**

УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт" ,
г.Гродна, РБ

У матэрыялах адной з навуковых канферэнцый намі была прадстаўлена інфармацыя аб прычынах ранняй смяротнасці беларускага вясковага насельніцтва у пачатку XIX стагоддзя (1). Мы праанілізавалі захворванні, якія выклікалі зніжэнне сярэдняй працяглацсі жыцця да 37...40 гадоў. Як вядома з літаратуры, у сучасны момант на здароўе чалавека аказвае значны ўплыў не толькі экалагічная абстаноўка, але і шкодныя, небяспечныя для яго звычкі, асабліва калі яны набываюцца ў ранні̇м узросце. Таму пачынаючы з 2000 – 2001 навучальнага года, студэнтам прапаноўвалася адказаць на некалькі пытанняў: Вы курыце? (так, не); Часта (так, не); Часам выпіваеце? (так, не); Часта? (так, не); Вы спрабавалі наркатычныя сродкі? (так,не).

У адказах удзельнічалі як хлопцы, так і дзяўчаты. Матэрыялы тут прадстаўлены толькі па мужчынскіх анкетах, якія разбіты на тры групы – студэнты стацыянару, груп пасля СГТ, а таксама завочнай формы навучання. Звычайна гэта былі студэнты другіх курсаў розных факультэтаў, за выключэннем груп СГТ, якія вучыліся на першым курсе. На малюнку 1 прадстаўлена колькасць анкетаваных студэнтаў у розныя гады (усяго 1167 асобаў).




Мал. 1. Колькасць студэнтаў, якія адказалі на пытанні анкеты

Курэнне з'яўляецца адной з найбольш распаўсюджаных шкодных



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

звычак , якая прыводзіць ў выніку да развіцця атэрасклерозу, ішэмічнай хваробы сэрца, хранічных захворванняў і рака лёгкіх, трахеі і бронхаў. На малюнку 2 прадстаўлены дадзеныя аб студэнтах (у %), якія ўжо маюць звычку курыць, а на малюнку 3 аб тых, хто лічыць, што ён курыць часта. Як відаць кураць толькі каля 40...60% студэнтаў стацыянара. У апошні час можна гаварыць аб тэндэнцыі некаторага росту долі студэнтаў, якія кураць.




Мал.2. Дынаміка долі студэнтаў, якія кураць




Мал.3. Доля студэнтаў, якія лічаць, што кураць часта

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

На усіх факультэтах сярод студэнтаў, якія працягваюць вучобу пасля тэхнікумаў з 2002 года ідзе зніжэнне прыхільнікаў ужывання тытуню, а тых хто курыць часта застаецца меней 10%, чаго нельга сказаць пра студэнтаў звычайнага стацыянару і завочнага аддзялення (мал.3).




Мал.4. Доля студэнтаў, якія лічаць,
што ўжываюць алкагольныя напоі часта.

Лічыцца, што чалавек спярша прызвычайваецца да курэння, а ўжо пазней да ўжывання алкаголю і наркатычных сродкаў. На пытанне “Вы выпіваеце?” адказваюць станоўча не меньш як 82% студэнтаў і толькі не больш за 15% з агульнай колькасці лічаць, што выпіваюць часта (мал.4), хоць магчыма адзначыць тут нейкую тэндэнцыю росту гэтай групы маладых людзей з 2001 года. Праўда, у катэгорыю тых, хто часта выпівае, увайшлі аматары піва. Таго піва, дзеля якога земляробы стараюцца даць краіне як мага больш піваваранная ячменю.

Апошняе дзесяцігоддзе мінулага стагоддзя характарызавалася ўзнікненнем новых пагроз здароўю чалавека: хуткім ростам колькасці хворых наркаманіяй і ВІЧ-інфекцыяй, якая аказалася цесна звязанай з ужываннем наркатычных сродкаў. Не абыйшла яна і шэраг рэгіёнаў РБ.

Вельмі нязначны працэнт студэнтаў выкарыстоўвае ін’екцыі наркотыкаў. Гэта радуе, і таму нязначныя дадзеныя не прадстаўлены ў артыкуле. Як відаць з малюнка 5, спрабавалі наркотыкі крыху больш за 30% студэнтаў, прычым рэдка хто ўказвае, што ўжывае іх часта. За 5 гадоў не назіраецца павелічэнне колькасці тых, хто хацеў бы паспрабаваць на сабе які-небудзь наркотык. Тут прыходзіцца толькі пашкадаваць, што мы не маем даных аб зменах у гэтых звычках у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

студэнтаў старэйшых курсаў. З малюнка 5 відаць, што сярод завочнікаў 2003-04 навучальнага года з 80 чалавек 44 ужывалі наркотыкі. Студэнты груп СГТ і па гэтаму паказчыку выглядаюць лепш за студэнтаў, якія паступілі на вучобу пасля сярэдняй школы. Тут магчыма такое прадпалажэнне, або гэта дзякуючы таму, што яны вучацца яшчэ на першым курсе, хоць і ў другім семестры, або тое, што яны, здаецца, лепш забяспечаны інтэрнатам, дзе знаходзяцца пад пастаянным наглядам з боку работнікаў інтэрнатаў.




Мал. 5. Доля студэнтаў, якія спрабавалі наркатычныя сродкі

Такім чынам, у сучасны момант перад выкладчыкамі і усімі тымі, хто працуе са студэнтамі, стаіць задача шляхам інфармацыйных мер уздеяння, накіраваных на фарміраванне здаровага ладу жыцця, выхоўваць у студэнтаў усведамленне адказнасці за сваё здароўе і садзейнічаць зніжэнню тых паказчыкаў, якія прадстаўлены ў графічным выглядзе вышэй.

Літаратура

1. Таранда М.І., Брэгер Г.М. Беларуская вёска ў люстэрку перапісаў сялян і царкоўных метрык першай паловы XIX ст. Сельское хозяйство – проблемы и перспективы. Сб.научн. трудов УО ГГАУ. Гродно, 2003. -Т.1, Ч.1.- С.30-33.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

**Резюме**

**Здоровый способ жизни - высшая ценность личности в XXI столетии**

**Таранда Н.И., Дубровский В.В.**

Получены данные по отношению студентов к курению, алкоголю и использованию наркотических средств. Отмечены различия в отношении их у разных групп студентов.

*Ключевые слова*: алкоголь, курение, наркотические средства, студенты

**Summary**

**Healthy way of life - the maximum value of the person in XXI century.**

**Taranda N.I., Dubrovskij V.V.**

The data under the attitude of students to smoking, alcohol and use of narcotics are received. Distinctions are marked concerning them at different groups of students.

*Key words*: alcohol, smoking, narcotics, students

УДК 378.016:502.1 (476)

## СОСТОЯНИЕ ОКРУЖАЮЩЕЙ СРЕДЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ И ЭКОЛОГИЧЕСКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ

**Пирожникова Т.В.**

УО «Гродненский государственный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Охрана окружающей среды и рациональное использование природных ресурсов являются неотъемлемым условием обеспечения экологической безопасности, устойчивого экономического и социального развития общества и относятся к приоритетным направлениям государственной политики Республики Беларусь.Основными принципами государственной политики в области охраны окружающей среды в Беларуси являются: государственная собственность на все виды природных ресурсов, предусматривающая, согласно действующему законодательству, возможность передачи их в постоянное или временное пользование юридическим или физическим лицам (земля для определенных целей может передаваться и в частную собственность); платность природопользования; система государственного контроля за состоянием природной среды и рациональным ее использованием; обязательная экологическая экспертиза всех проектируемых, строящихся и реконструируемых хозяйственных объектов; система мер финансовой, административной и уголовной ответственности за нарушения природоохранного законодательства и возмещение нанесенного ущерба за счет нарушителей. Реализация государственной экологической политики осуществляется по таким основным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ